✓ **З 30 студзеня** ў галерэі «Мабільная» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі) пачала працу **фотавыстаўка Васіля Белякова «Таямніцы беларускай прыроды»**. Аўтар вандруе па роднай краіне з мэтаю знайсці, заўважыць, убачыць і зафіксаваць усё самае цікавае, непаўторнае. Падарожнікам у пешых і веласіпедных маршрутах за 2013 – 2019 гг. пройдзена 30 тыс. кіламетраў, адзнятая вялікая маса фотаматэрыялу. Цягам апошняга дзесяцігоддзя ягоныя стыль, сэнс і лад жыцця – адкрыць дзіўныя таямніцы роднай прыроды, адлюстраваць спалучэнні колераў, заўважыць адзінства супрацьлеглага, спалучыць неспалучальнае, дачакацца ўнікальнага і занатаваць чароўнае.

Магчыма, гэтая фотавыстаўка звярне ўвагу наведнікаў на тыя мясціны, куды не давялося кінуць погляд жывапісцам, але куды змог зазірнуць апантаны ідэяй фатограф.

Пабачыць фотатворы можна да 31 сакавіка.